рии по случаю ее коронования. [4] Суматоха, вызванная плотным графиком посещения Англии, Орлову чрезвычайно не нравилась, и побуждался он «исключительно приверженностью…к нашему обожаемому Государю» [8].

Бенкендорф, исходя из содержания письма, в это время оправлялся от болезни, и Орлов посвящает этому обстоятельству целый абзац, убеждая того не относиться к болезни «легко», беречься и не «увлекаться усердием…к Государю». Кроме того, Орлов замечает, силу их дружбы, которую невозможно было бы заподозрить, судя лишь «по придворному…положению» [4, с. 527]. Любопытно, что в этих словах, кроме очевидного вывода о близком расположении Орлова и Бенкендорфа, можно обнаружить и мысленное разделение, которое проводил Орлов между своими личными отношениями и отношениями государственными. Несомненно, деление это не было абсолютным, что доказывается самим фактом существования дружбы между двумя государственными служащими, но внешняя сторона вещей, открытая постороннему наблюдателю могла и не обнаруживать тесных дружеских связей между мужчинами, воспринимая их отношения как дело долга или этики. Этим обстоятельством (а именно различием между придворным положением и личным пристрастием) может объясняться взгляд некоторых историков на Орлова как на человека весьма циничного и высокомерного.

**Заключение.** Таким образом, описание фигуры князя А.Ф. Орлова в литератуных источниках является достаточно противоречивым. С одной стороны – это службист, чиновник – консерватор, ориентированный на успешную карьеру. С другой стороны, Орлову присущи черты человека способного на дружбу, личную привязанность, любовь.


1. Зиза Е. Н. Алексей Федорович Орлов (1786-1861) - государственный деятель России первой половины XIX века :автореф. дис. … канд. ист. наук (07.00.02). Санкт-Петербург, 2001. С. 4
2. Лемке М. К. Николаевские жандармы и литература 1826-1855 гг.: По подлинным делам Третьего отделения Собств. Е.И. Величества Канцелярии. Изд. 2-е. – СПб.:Бунин,1909. 614 с.
3. Орловы // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. т. XXII, 1897. с. 170-171
4. Князь Алексей Федорович Орлов // Русский биографический словарь А. А. Половцова. т. 12. 1902. с. 330
5. Адрес-календарь. Общая роспись всех чиновных особ в государстве, 1857 : [В 2-х ч.]. - СПб. : Имп. Академия наук, 1857. Ч. 1. - 1857. С. 30.
6. Панаева А. Я. Воспоминания / А. Я. Панаева (Головачева); [вступ. ст. К. Чуковского; примеч. Г. В. Краснова, Н. М. Фортунатова]. - Москва: Правда, 1986. – 508 с.
7. Вигель Ф. Ф. Записки. Т. 2. - М.: Круг, 1928. С. 109
8. Два письма князя А. Ф. Орлова к графу А. Х. Бенкендорфу // Русский архив, 1889, № 7, С. 526


## ПРАБЛЕМА ЗАБРУДЖВАННЯ ВАДАЁМАЎ ЦВЁРДЫМІ АДХОДАМІ Ў АСІПОВІЦКІМ РАЁНЕ БССР У ПЕРЫЯД ПЕРАБУДОВЫ


***Завацкі Я.І.,***
*аспірант БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Паддубская А.Ф.,*** *канд. гіст. навук, дацэнт*


Асіповіцкі раён – буйны прамысловы цэнтр Магілёўскай вобласці, праз тэрыторыю якога працякаюць 3 вялікія ракі – Бярэзіна, Свіслач і Пціч, 14 малых рэк, цэлая сетка меліярацыйных каналаў. Усяго вадой ахоплена тэрыторыя раёна больш за 4 тысячы гектараў – 2% ад агульнай плошчы. Інтэнсіфікацыя прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, павышэнне добраўпарадкаванасці населеных пунктаў Асіповіцкага раёна, як і БССР ў цэлым, у пасляваенны перыяд прывяло да інтэнсіўнага забруджвання рэк і Асіповіцкага вадасховішча сцёкавымі водамі і цвёрдымі адходамі [5, с. 3]. Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена тым, што забруджванне значных для раёна водных рэсурсаў адлюстроўвала экалагічную сітуацыю ў рэспубліцы ў цэлым і даказвала неабходнасць кардынальных перамен ва ўзаемаадносінах чалавека і прыроды. Для выпраўлення нездавальняючай сітуацыі, звязанай з аховай навакольнага асяроддзя, на мяжы 1980–1990 гг. савецкая экалагічная палітыка была пераведзена на шлях інтэнсіфікацыі. Ён прадугледжваў, перш за ўсё, прафілактыку стану навакольнага асяроддзя, а не кантроль парушэнняў. Дадзеная палітыка таксама адказвала за павышэнне ў насельніцтва ведаў аб прыродзе [2, с. 3, 4]. Мэта даследавання – выявіць праблему забруджвання вадаёмаў цвёрдымі адходамі ў Асіповіччыне на мяжы 1980–1990-х гг.



Репозиторий ВГУ

**Матэрыял і метады.** Крыніцазнаўчай базай даследавання выступілі матэрыялы перыёдыкі, а менавіта матэрыялы рэспубліканскага натуралістычнага часопіса «Родная прырода» і раённай газеты Асіповіцкага раёна «Запаветы Леніна», на старонках якой шырока асвячаліся мясцовыя экалагічныя праблемы як з боку пасадовых асоб, так і з боку асобных грамадзян падчас перабудовы. Пры напісанні даследавання былі выкарыстаны агульналагічныя метады (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, аналогія і параўнанне) і спецыяльныя гістарычныя метады (гісторыка-сістэмны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-генетычны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Адной з крыніц забруджвання водных аб'ектаў Асіповіцкага раёна цвёрдымі адходамі з'яўлялася рэкрэацыйная дзейнасць. Аб адмоўным уплыве прамога рэкрэацыйнага ўздзеяння на р. Свіслач, ля берага якой размясцілася в. Вяззе, паведамляў у жніўні 1988 г. у сваім лісце настаўнік Вязскай сярэдняй школы С. Лукашэвіч. У прыватнасці, ён сцвярджаў: «Калі прайсці па беразе [Свіслачы – рэд. Я.З.] уздоўж вуліцы імя Багдановіча, то месцамі ён нагадвае сапраўдны сметнік. Тут валяецца абрэзанае голле дрэў, кансервавыя бляшанкі і шкляныя слоікі, бітае шкло. Тут патыхае затхласцю і смуродам. А прыбярэжны зялёны паплавец няпрошаныя «госці» з Асіповічаў, Бабруйска, Мінска і другіх аддаленых месцаў пераўтварылі ў стаянку і мыйку сваіх аўтамабіляў і матацыклаў. Тут каля самай вады можна ўбачыць нават аўтафургоны. Сваім транспартам гэтыя гора-аматары прыроды псуюць зялёнае покрыва, забруджваюць нафтапрадуктамі ваду і бераг. Але ж гэта любімае месца адпачынку не толькі дарослых, а і дзяцей» [4, с. 3].

У адказ на агідныя паводзіны адпачываючых у прыбярэжнай зоне старажылы вуліцы імя Багдановіча неаднаразова звярталіся да выканкама Вязскага сельсавета. Аднак на ўсе скаргі прадстаўнікі ўлады аднекваліся: «А што мы можам зрабіць?»

Варта адзначыць, што ў красавіку 1988 г. у Вязскім сельсавеце адбыўся сход жыхароў вуліцы імя Багдановіча, на якім абмяркоўвалася пытанне навядзення парадку ў прыбярэжнай зоне. Вяскоўцы абяцалі прыбраць смецце на беразе Свіслачы, а выканкам сельсавета – прыняць адпаведныя захады да названых гасцей. Акрамя гэтага, было вырашана паставіць на вуліцы сметніцы, устанавіць таблiцы і знакі, якія забаранялі распальванне вогнішчаў на беразе, пад'езд і стаянку аўтамабіляў і матацыклаў каля Асіповіцкага вадасховішча.

На тым сходзе прысутнічаў раённы інспектар Дзяржаўнага камітэта БССР па ахове прыроды У. Пчалінцаў, які азнаёміў прысутных з прыродаахоўным заканадаўствам. У прыватнасці, яно прадугледжвала, што ў 15 метрах ад ракі, возера павінны адсутнічаць усялякія пабудовы, а ў 50–60 метрах – знаходзіцца транспарт. Што ў прыбярэжнай зоне забараняецца псаваць і высякаць дрэвы. За такія парушэнні віноўныя строга караліся паводле закона.

Аднак праведзены ў вёсцы сход аказаў слабае ўздзеянне на папярэджанне забруджвання прыроды. Праз тры месяцы забараняльныя знакі так і не былі ўсталяваны, за выняткам знака каля варот Дома культуры. Жыхары, у сваю чаргу, употай працягвалі выносіць і вывозіць на бераг смецце з-за адсутнасці кантэйнераў для его. Прыезджыя «аматары» прыроды па-ранейшаму адпачывалі на беразе Свіслачы, дапякаючы вяскоўцаў шумам матораў матацыклаў і аўтамашын. На заўвагі мясцовых жыхароў мясцовыя ўлады паўтаралі: «А што мы можам зрабіць?» [4, с. 3]

Нездавальняючая сітуацыя з выкананнем водаахоўнага заканадаўства складвалася і ў іншых населеных пунктах. Так, у 1989 г. пазаштатны карэспандэнт «Запаветаў Леніна» М. Закрэўскі паведамляў, што правы бераг р. Бярэзіны, на якім размясціўся п. Ялізава, забруджаны розным смеццем. «Усюды насупраць хат, што прымасціліся на высокім абрыве, увесь бераг ракі закіданы рванымі ботамі, чаравікамі, зламанымі драўлянымі скрынкамі, бляшанкамі з-пад кансерваў, шклабоем і іншымі непатрэбнымі рэчамі», – пісаў М. Закрэўскі [1, с. 3]. Як ён прызнаваўся, пасялкоўцы былі вымушаны скідваць смецце на бераг ракі з-за адсутнасці спецыяльна адведзенага для адходаў месца. Смецце, у сваю чаргу, з-за навальнічных дажджоў трапляла з абрыву ў Бярэзіну, якую забруджваў у дадатак шклозавод «Кастрычнік» [1, с. 3].

Вышэйадзначаныя факты даказваюць, што забруджванне вадаёмаў цвёрдымі адходамі адбывалася па віне не толькі насельніцтва, але і мясцовых кіраўнікоў. Аб гэтым яс-



Репозиторий ВГУ

крава сведчыць сітуацыя, якая склалася ў 1989–1990 гг. з захламленасцю прыбярэжнай паласы Асіповіцкага вадасховішча ў раёне былога водазабора чыгуначнага вузла. Яго кіраўніцтва без папярэдняга ўзгаднення пачало будаваць базу адпачынку на 24 месцы для сем'яў чыгуначнікаў. Паколькі на тэрыторыі колішняй помпавай станцыі засталіся разабраны бульдозер, кантэйнер і будаўнічае смецце, будаўніцтва аб'екта было прыпынена на падставе «Палажэння аб водаахоўных палосах (зонах) вадаёмаў Беларускай ССР», зацверджанага пастановай Савета Міністраў ад 14 чэрвеня 1989 г.

З мэтай выпраўлення становішча гаррайінспекцыя па ахове прыроды выдала абавязковае прадпісанне № 1 ад 2 лютага 1990 г. начальніку вагоннага дэпо В. Атрохаву, каб ён арганізаваў ачыстку ўчастка ў прыбярэжнай зоне вадасховішча да 1 сакавіка 1990 г. Аднак В. Атрохавым не былі прадпрыняты якія-небудзь захады па выкананні прадпісання. У выніку гаррайінспекцыя выпісала пратакол № 6 ад 26 сакавіка 1990 г. аб парушэнні водаахоўнага заканадаўства, згодна з якім на начальніка вагоннага дэпо быў накладзены штраф у памеры 60 рублёў.

Тым не менш, дадзены захад пакінуў праблему забруджвання ўчастка вадасховішча без змен. Па гэтай прычыне гаррайінспекцыя была вымушана падаць матэрыялы па факце парушэння водаахоўнага заканадаўства ў гарадскі камітэт народнага кантролю. Праверка, якая адбылася 4 мая 1990 г., устанавіла, што прыбярэжная паласа была нарэшце ачышчана [6, с. 3].

**Заключэнне.** На падставе вышэйадзначаных фактаў становіцца відавочна, што праблема забруджвання вадаёмаў Асіповіцкага раёна ў гады перабудовы была выклікана, перш за ўсё, нізкай экалагічнай культурай як насельніцтва, так і вертыкалі ўлады. Дзеля выканання плана партыйныя і гаспадарчыя кіраўнікі маглі прыносіць у ахвяру інтарэсы прыроды, кіруючыся пры гэтым прынцыпам: нам трэба выконваць дзяржаўны план, а аховай прыроды займайцеся вы, біёлагі. Такая пазіцыя з'яўлялася праявай недахопу экалагічнага выхавання і прафесійнай прыродаахоўнай адукацыі. Да канца перабудовы ў БССР актыўна працавалі станцыі юных натуралістаў, школьныя лясніцтвы, гурткі юных біёлагаў, эколагаў, географаў. Але падобная дзейнасць ахоплівала ў кожнай школе толькі дзясяткі дзяцей. Астатнія ж школьнікі абмяжоўваліся тымі ведамі, якія яны атрымлівалі на ўроках па прыродазнаўчых прадметах. Па гэтай прычыне выпускнікі школ былі мала кампетэнтны ў пытаннях аховы прыроды. Яны ішлі на вытворчасць, у сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, але і тут справа экалагічнага выхавання аказвалася не на належным узроўні. У вну і тэхнікумах на будучых спецыялістаў затрачвалася ў лепшым выпадку 10-20 гадзін курса аховы прыроды, на вытворчасці – рэдкія лекцыі ці размовы, якасць якіх часам была невысокай [7, с. 4–5].

Інтэнсіфікацыя савецкай экалагічнай палітыкі на мяжы 1980–1990-х гг. дазволіла правільна ацаніць экалагічную работу па паніжэнні, а затым і ліквідацыі шкодных выкідаў на прадпрыемствах і ў гаспадарках. Падобная палітыка таксама характарызавалася шырэйшым прыцягненнем да вырашэння розных праблем спецыялістаў-эколагаў, правядзеннем экалагічных экспертыз аб'ектаў, якія будаваліся, і г.д. [2, с. 3; 4; 3, с. 7].

Каб пераадолець рызыкі, звязаныя з парушэннем прыродаахоўнага заканадаўства, пастановай Савета Міністраў БССР ад 14 сакавіка 1991 г. № 85 зацвярджалася Рэспубліканская праграма па адукацыі ў вобласці навакольнага асяроддзя на 1991–1995 гг., якая прадугледжвала выпрацоўку ва ўсяго насельніцтва навыкаў рацыянальнага прыродакарыстання.

1. Закрэўскі, М. Нямы дакор / М. Закрэўскі // Запаветы Леніна. – 1989. – 25 лютага. – С. 3.
2. Казлоў, В. Асноўныя напрамкі работы / В. Казлоў // Родная прырода. – 1988. – № 4. – С. 3–4.
3. Кручкова, Н. Занепад культуры – крызіс экалогіі / Н. Кручкова // Родная прырода. – 1990. – № 1. – С. 6–7.
4. Лукашэвіч, С. Зямля радзімая / С. Лукашэвіч // Запаветы Леніна. – 1988. – 2 жніўня. – С. 3.
5. Мурашко, М. Г.Водные ресурсы Белоруссии и перспективы их использования / М. Г. Мурашко, И. Е.Куксин,. – Минск: «Наука и техника», 1976. – С. 24.
6. Па слядах нашых выступленняў // Запаветы Леніна. – 1990. – 2 чэрвеня. – С. 3.
7. Савіцкі, Б. Экалагічныя веды – кожнаму / Б. Савіцкі // Родная прырода. – 1985. – №3. – С. 4–5.

Репозиторий ВГУ